Школьная бібліятэка

Сучасная беларуская драматургія

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
2009

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-6
С61

Серыя заснавана ў 1965 годзе

Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Друкуецца паводле выданняў:
Звон — не малітва. — Мінск : Маст. літ., 2008;
Сучасная беларуская п’еса. — Мінск : Маст. літ., 2008.

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-02-1138-5

Раіса Баравікова

Раіса Баравікова нарадзілася 11 мая 1947 года ў вёсцы Пешкі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Бярозаўскай сярэдняй школы (1965) працавала літсупрацоўнікам у быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя». Скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута ў Маскве (1971). Працавала рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм» (1971–1972). У 1972–1977 гадах – карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва», у 1983–1988 гадах – літкансультант рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», потым рэдактар часопіса «Алеся». З 2002 года – галоўны рэдактар часопіса «Маладосць».

Узнагароджана медалём Францыска Скарыны.

У друку выступае з 1960 года. Выдала зборнікі паэзіі «Рамонкавы бераг» (1974), «Слухаю сэрца» (1978), «Такое кароткае лета» (1981), «Адгукнуся голасам жалейкі» (1984), «Каханне» (1987), «Пад небам першага спаткання» (1990) і іншыя, кнігу прозы «Вячэра манекенаў» (2002).

Аўтар кніжак казак і апавяданняў для дзяцей, п’ес «Барбара Радзівіл» (1992, пастаўлена ў 1994)[1]*, «Пятля часу» (1996, пастаўлена ў 2001).*

[1] Тут і далей у дужках падаюцца гады першай публікацыі і пастаноўкі *(заўв. рэд.)*.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1987) за кнігу лірыкі «Каханне», Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1994) за кнігу «Люстэрка для самотнай» і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (1998).

Барбара Радзівіл

Драматычная паэма ў дзвюх дзеях

«1545 год. У чэрвені месяцы ў Пятроў пост памерла ў Вільні ў панядзелак каралева Эльжбета і пахавалі яе ля святога Станіслава ў капліцы Казіміра ў жніўні 24 дня. А пасля маладыя кароль, маючы слабасць да бялявых, пачаў мілаваць Барбару Радзівіл, якая была ўдавою Гаштольта, ваяводы троцкага, і жыла на той час пры сваёй маці і брату, падчашаму Мікалаю Юр'евічу Радзівілу. І кароль пачаў хадзіць да яе ноччу з палацу аж да дому яе і там у яе бываў часта».

З летапісу Рачынскага

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Барбара Радзівіл — удава ваяводы троцкага Гаштольда.
Жыгімонт II Аўгуст — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага.
Радзівіл Мікалай Руды — родны брат Барбары.
Радзівіл Мікалай Чорны — стрыечны брат Барбары.
Бона Сфорца — маці Жыгімонта II Аўгуста.
Дамінік — мастак.
Людвік Монці — сакратар Боны.
Станіслаў Давойна — лекар Жыгімонта II Аўгуста.
Соф'я — камедыянтка.
Ян Танчынскі — ваявода з акружэння Боны.
Падлетак — хлопчык з крыламі анёла.
Камердынер.
Пакаёўка Барбары.
Пакаёўка Боны.
Малады мешчанін.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Ужо некалькі гадоў палкае каханне звязвае Барбару Радзівіл і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Жыгімонта II Аўгуста. Надыходзіць год 1547.

Сцэна першая

Ліпень. Вільня. Невялікая зала, ababітая блакітным атласам. Ва ўсім — бляск, багацце. Ля агромністага палатна з пэндзлем — мастак Дамінік. На фоне цяжкой цёмна-сіняй шторы, вытрымліваючы паставу, застыў Радзівіл Мікалай Руды. Праз адчыненае акно на чорна-белыя квадраты бліскучага паркета падаюць сонечныя промні.

Мікалай Руды

Дзіўлюся, як жа хутка ты пранік
у таямніцы фарбаў, тонкіх тонаў...
Нядаўна чуў, шаноўны Дамінік,
што ўхвалены ты быў самою Бонай!

Дамінік *(адрываецца ад палатна)*

Там на палотнах ёсць рука мая,
таму хацеў бы верыць гэтай славе,
але майстроў не гэтакіх, як я,
даволі бачыў беласценны Вавель[1]!
(Зноў схіляецца да палатна.)

Мікалай Руды *(мяняючы позу)*

Майстры паўсюдна ёсць, але твой дар
тут, на Літве, ва ўсёй красе адкрыўся.
Што ж — радуйся!
Са славай парадніўся!
А слава...
(Задумаўся.)
Як жаночы вабны твар!

Дамінік *(ажыўлена)*

Прыцягвае... А як распаліць мары!
(Уздыхае.)

[1] Крэмль у Кракаве, дзе жылі дынастыі польскіх каралёў.

Мяне такая слава абміне!
Хачу пісаць партрэт...

Паўза.

Сястры вашай Барбары,
а ёй чамусьці ўсё не да мяне!

У залу ўваходзіць Радзівіл Мікалай Чорны. Акідвае хуткім позіркам палатно. Пераводзіць позірк на Дамініка. Пасля на Радзівіла Мікалая Рудога.

Мікалай Чорны
Зайздрошчу, брат!
Я ўвесь жыццёвым друзам
аблытаны...
А ты надоўга знік,
лічы, ў абдымкі да прыгожых музаў!
(Да мастака.)
Як твае фарбы, мілы Дамінік?
(Падыходзіць бліжэй да палатна.
Разглядвае партрэт.)

Дамінік
Нішто... Нішто...
Хоць фарбы не з агню,
а на партрэце блікамі іграюць.
(Паспешліва збірае фарбы, пэндзлі,
складвае ў скрынку, якая стаіць тут жа.)

Мікалай Чорны
Заўважыў я...
І ўсё ж перапыню!
(Да Мікалая Рудога.)
Брат, ты не супраць?
Справы нас чакаюць!

Мікалай Руды
Вядома! А ты з дому ці з Двара?
Адкуль такая пільнасць,
скуль навіны?!
(З лёгкай усмешкай.)

Ці мо бяда якая, як гара,
і ўсе мы ратавацца тут павінны?!

Мікалай Чорны

Бяды няма. Якраз наадварот!

Дамінік раскланьваецца.

Дамінік *(вельмі пачціва)*

Размоў жадаю ў ласцы вам ды ў міры!

Мікалай Руды ўзмахвае рукой, як адмахваецца, маўляў, ідзі, ідзі... Мікалай Чорны на Дамініка ўвогуле не звяртае ніякай увагі. Дамінік выходзіць.

Мікалай Чорны

Табе вядомы тытул[1]...
(Вытрымлівае паўзу.)
На ўвесь род
сваім загадам Жыгімонт пашырыў!

Мікалай Руды *(не можа схаваць радасці на твары)*

Хадкевіч жа малодшы мне грaзіў,
нібыта хутка трапім мы ў няміласць!
А тут...

Мікалай Чорны

Загад і... рымскія князі!

Мікалай Руды

Дзе добра ўгноена,
там добрая ўрадлівасць!
І Жыгімонт разлічвае на нас...
Пакуль у розных справах мы ў даверы.

Мікалай Чорны азіраецца.

Мікалай Чорны

Скажы, вушэй не маюць тваe дзверы?
(Прыцішвае голас.)
Прыйшоў, здаецца, наш жаданы час!

[1] У 1515 годзе адзін з прадстаўнікоў роду Радзівілаў Мікалай Мікалаевіч атрымаў тытул князя Рымскай імперыі. У 1518 годзе гэты тытул быў пацверджаны ў Вялікім княстве Літоўскім, а ў 1547-м пашыраны на ўвесь род загадам Жыгімонта Аўгуста.

А твой Хадкевіч знаў, пра што казаў,
і я таму ніколькі б не здзівіўся,
каб ля Барбары Жыгімонт не віўся,
бы ўвесну вінаградная лаза!

Мікалай Руды

Барбара?..
Да чаго, скажы, яна?
Яны ўдваіх, дык проста глянуць люба!

Мікалай Чорны

А тут табе пад рэбры навіна!
У замку пахне ўжо законным шлюбам!

Паўза.

Ў заходнія сталіцы наш Лясота[1]
для гэтага імчаў...
Заўваж, употай!
І кажуць, што не супраць бачыць Бона
прусачку Ганну Соф'ю[2] нарачонай.

Мікалай Руды *(абурана. Вельмі ўражаны тым, што пачуў)*

А Жыгімонт?! Ён выглядае хлюстам!

Мікалай Чорны *(смяецца)*

Ты пра яго сказаў ужо загуста!
Ён цягне час, захоплены Барбарай.
Скажы, на троне —
ці ж благая пара?!

Мікалай Руды

Але яна не думае пра трон!

Мікалай Чорны

Вось тут якраз падумаць мог бы ён,
З кім два гады так прагна дзеліць ложак...
Ды што казаць! Яму мы дапаможам.
(Думае.)
Барбары трэба знікнуць! Адцурацца!
Тады яе ён стане дабівацца.

---

[1] Віленскі шляхціц, які пасылаўся Жыгімонтам Аўгустам у сталіцы заходніх дзяржаў, каб той вёў перамовы наконт шлюбу.

[2] Дачка прускага князя Альбрэхта.

З усёю апантанасцю, шалёна!
Глядзі, і блісне нам тады карона!

М і к а л а й Р у д ы

Гаворыш, бы не ведаеш жанчыны.
Як знікнуць ёй,
калі няма прычыны!

М і к а л а й Ч о р н ы *(узрываецца)*

Прычыны?
(Катэгарычна.)
Шлюб! Дзеля яго Лясота
ганцом на захад быў пасланы ўпотай!

У залу ўваходзіць Б а р б а р а. Лёгкая і разам з тым грацыёзная. Яна паставай нагадвае маладзенькую дзяўчынку, а тварам — жанчыну, якой салодка быць менавіта жанчынай: спакушаць, абяцаць і... лянуцца на каханне.

Б а р б а р а *(здзіўлена і злёгку насмешліва. Да Чорнага)*

О, Мікалай! А дзе ж заўсёдны крык?!
(Яшчэ больш насмешліва.)
Дзе ты, браток,— там гамана да столі...
Ты крыўдзішся? Не буду больш, даволі!
Мяне цікавіць толькі Дамінік.
(Азіраецца па баках, позіркам шукае Дамініка.)

М і к а л а й Р у д ы

Ён заўтра будзе. Тут такія справы...

М і к а л а й Ч о р н ы

Ты не цягні! Скажы пра ўсё як ёсць!
І выйсце знойдзем з гэтае праявы...
(Да Барбары.)
Я ў вашым доме, думаю, не госць?

М і к а л а й Р у д ы

Вядома, свой!
Ты наш стрыечны брат
і на любую раду маеш права.

М і к а л а й Ч о р н ы *(яму надакучылі неабавязковыя размовы)*

Барбара, слухай, горкая ў нас справа,
усім вядома, хто твой амарат[1].

[1] Каханак.

Б а р б а р а
I што з таго?
М і к а л а й   Ч о р н ы
Даруй, магчыма, груба...
Ён цешыцца з табой, а думае аб шлюбе!
Нашчадак трэба! Узмацненне трона!
Ёсць чуткі, што вядзе перагаворы Бона.
М і к а л а й   Р у д ы *(асцярожна)*
Дый сам ён гэтым клопатам заняты.
Б а р б а р а *(не можа паверыць)*
Вы ў розуме сваім ці вы вар'яты?!
(З папрокам.)
Браты нібыта, а на справе рады
ублытацца ў цянёты нейкай звады.
М і к а л а й   Ч о р н ы *(злосна)*
Ты лічыш, звада? У пачуццях вера
не лепшае...
(З іроніяй.)
Спяшайся памыліцца!
Шлюб ладзіцца! Якраз з такім намерам
ганец быў у заходнія сталіцы,
і, можа, не адзін...

Паўза.

Сужыцелька! Мо не?!
Гаштольдава ўдава...
На шыі ў брата!
Ён нават і рукой не варухне,
як хтось цябе адважыцца пасватаць!
Яму ўсё роўна!
Сёння — ты, а там...
Б а р б а р а *(з адчаем)*
Спыніся! Я не веру! Што вам трэба?

Паўза.

А брату я ўсё братава аддам...

М і к а л а й   Ч о р н ы *(задаволена пасміхаецца)*

Ага... Згасае прад вачыма неба!

М і к а л а й   Р у д ы *(збянтэжана)*

Нічога мне не трэба аддаваць.
Адмовіцца ад Жыгімонта варта!

М і к а л а й   Ч о р н ы *(да Рудога)*

Гляджу, яе пачаў ты шкадаваць!
(Падыходзіць да Барбары.)
Не вер, не вер...
Стой на сваім упарта!

Б а р б а р а *(гатова заплакаць)*

Ідзіце прэч!

М і к а л а й   Ч о р н ы *(хутка пагаджаецца)*

Мы пойдзем! Ты падумай.
Замнога навалілася адразу...

Мікалай Чорны і Мікалай Руды ідуць да дзвярэй.

М і к а л а й   Р у д ы *(са шкадаваннем)*

Усё пайшло такім раптоўным тлумам.

М і к а л а й   Ч о р н ы *(азіраецца. Да Барбары)*

Пакінь яго! Мы прыйдзем за адказам.

Выходзяць. Барбара застаецца адна.
Паўза.

Б а р б а р а *(на нейкі момант задумліва)*

Паўстала зло...
і ў сэрцы рухнуў хорам.
Нянавісцю кіпець спрабуе кроў,
і розум слепне. Яву мела ўчора,
а сёння — сколкі недаснёных сноў!
Каханая...
(Голас затрапятаў.)
Ноч клікала да Бога.
Сужыцелька...

Паўза.

А дзесь імчыць ганец,
і ты не маеш права анікога
ў тым вінаваціць, стаўшы пад вянец
патайнага, няўтрымнага жадання...
Анёлы адслужылі ўсё сваё,
і вось прыйшла хвіліна пакарання –
у сэрца д'ябал цэліць вастрыё,
скляпанае з ілжы,
з інтрыг,
з атруты...
(Нечакана гнеўна.)
Прымі яго і д'яблу дай зарок!
І выслізні гадзюкаю з пакуты,
і джаль таго, каго мілуе зрок,
з кім зноў і зноў дзяліць свой
будзеш ложак,
джаль вуснамі, хай носіць, як апёк,
мой пах, мой дух,
што сцерці ўжо не зможа,
апёк – кляймо... У помсту ўжо! Знарок!
(Нібыта нешта ўяўляе.)
Бяжы насустрач, з горда ўзнятым тварам,
як сарна... не забыўшы аднаго:
пі ўдосталь, захлынайся згубным жарам
і здзекуйся са слабасці яго.
Хай пашквілюсы ўсе муры і вежы
аздобяць і на вочы трапяць Той,
што будзе да канца яму належаць,
працятая атрутнай віднатой:
ён быў маім!
Маім! І што карона?!
Нас звязвала бяздонне нашых губ:
п'еш – не нап'ешся...

Паўза.

Каралева Бона?!
Яму ці ёй патрэбен гэты шлюб?

У залу вяртаецца Радзівіл Мікалай Руды. Адзін. Барбара адыходзіць у глыб залы. Гавораць на адлегласці.

Мікалай Руды *(знарок падкрэслена бадзёра)*
Як вырашыла ты? Перажыла?
(Смяецца.)
У гэткай справе розум не залішні.
Што цвет раскошны колішні для вішні,
калі вясной нядаўняй не цвіла?!

Барбара *(асцярожна)*
Цябе не разумею. Толькі ўчора...

Мікалай Руды
Не дагаворвай! Аўгуст быў з табой!
У скрыні — падарункі,
кветак — мора...
Ты цешся, але Чорны за сцяной
мяне чакае...
Нам патрэбна згода.
(Рашуча.)
Ад Аўгуста адмоўся назаўжды!

Барбара
Якая ж вам ад гэтага выгода?
Пакуль ні ў чым не бачу я бяды.
Наадварот...

Мікалай Руды *(узрываецца)*
Табе да сэрца, бачу, насміханне?
У кожным горле — косткай Радзівілы.
Калі б маглі — ўзнялі б цябе на вілы!
На родзе скула — нам тваё каханне!

Барбара
Вы пачалі не з гэтага —
з танцоў!
У розныя заходнія сталіцы...
Цяпер звязаць не можаце канцоў?!

Мікалай Руды *(разводзіць рукамі)*
Не бачыў свет яшчэ такой дурніцы!
Ды нават нейкі дробненькі шляхтун
за брамаю... ледзь выблісне заранка:

«Паскудніца! Паганка! Выляжанка!»,
а хутка стане Аўгуст твой, што ўюн.
Май гонар! Ты сястра мне па крыві.

Б а р б а р а

Хм-м... З сястрою адпаведна і жыві...

Паўза.

Замысліў нешта Чорны...
Звадыяш!
Але калі ўжо церпіць гонар наш...

М і к а л а й Р у д ы *(радасна)*

Ты згодна?!

Паўза.

Мо паедзь у Геранёны[1]?
Хай будзе Аўгуст цалкам адлучоны!

Б а р б а р а *(як адрэзвае)*

Мне добра тут! Ты зняў з душы вярыгі?

М і к а л а й Р у д ы *(падкрэслена лагодна)*

А ты? Паўсюдна бачыш цень інтрыгі!

Трошкі марудзіць. Задаволена пасміхаецца. Выходзіць.

Паўза.

Барбара пачынае хадзіць з канца ў канец залы. Настрой мяняецца.

Б а р б а р а

Цяжкі дурман у галаве!
(З адчаем.)
Пачуццям як угаманіцца?
Ах, Аўгуст... Княжыць на Літве,
а трызніць аб чужых сталіцах.
(Гатова ўзарвацца.)
Які раптоўны інтарэс?

[1] Замак Гаштольда Станіслава, першага мужа Барбары, які памёр у 1542 годзе.

Чыё прывабіла аблічча?
Чый стан яго няўхільна кліча?
Пытанняў – непраходны лес!
Свой боль хачу расперазаць,
а ў сэрцы, чую, глухне вера...
(Амаль пяшчотна.)
Ужо ніколі не сказаць,
што я – рака,
 а ён – мой бераг!
(З прыкрасцю.)
Пярэварацень... Здань начы!
Было такім жаданым цела!
Начною птушкай на плячы
ад новых ласкаў так трымцела.

Паўза.

І што мог падказаць мне дзень?
Хавала здрада ўсе прыкметы.
Хай пасмяецца зараз цень
заўчасна згаслае Эльжбеты[1]!
(Нервовы смех, як плач.)
Эльжбета...
 З Кракава... сюды!
Каранаваная, і тут жа...
Наложніца – сляды ў сляды,
больш даражэйшая для мужа.
А потым я... Ён гэта мог!
Самоту не ўтрымаць у скрутку.
Эльжбета, поўная трывог,
канала ля яго ад смутку.
(Думае, магчыма, нешта ўспамінае.)
Нібыта выеў вочы дым!
(З пачуццём раскайвання.)
Ён жа, вясёлы і ўлюбёны,

[1] Эльжбета Аўстрыйская, першая жонка Жыгімонта Аўгуста, памерла ў 1545 годзе.

яшчэ жалобным днём сваім
імчаў да нас... у Геранёны!
(Спыняецца.)
Я — грэшніца! Бог не са мной,
адвернуты, Ён грэх не зніме...
І тыя двое... за сцяной
(выдыхае, як стогн)
не памыліліся.
Я — з імі!

Сцэна другая

Плошча, на якую выходзіць дом з балконамі. На адным з балконаў жанчына трасе коўдры, адзенне. Унізе, ля дома, стары ганчар расстаўляе свае вырабы на продаж: збанкі, місы, гаршкі... Ужо з'явіўся пакупнік: малады мешчанін прыцэньваецца да збанка. Тут жа недалёка стаіць карэта. Ля адчыненых дзверцаў — Радзівілы: Мікалай Руды і Мікалай Чорны.

Мікалай Чорны *(азірае плошчу)*
Адны трасуць на плошчы гэтай транты,
другія ладзяць гандаль свой штодня...

На плошчу выязджае фургон, абклееныкаляровымі афішамі. Спыняецца. Гэта вандроўны тэатр.

Мікалай Руды *(з цікавасцю)*
А трэція, глядзі,— камедыянты,
для іх усё жыццё — адна гульня!

У фургоне — шум, жаночы смех. З'яўляюцца камедыянты. Яны выцягваюць з фургона скрыні і цюкі, а таксама дэкарацыі. Кідаецца ў вочы выразанае з фанеры дрэва з чырвонымі яблыкамі, пашыты зануч Змей, што адразу наводзіць на знаёмы біблейскі сюжэт.
З фургона выскоквае маладзенькая дзяўчына. Гэта — камедыянтка Соф'я. Бліскучыя чорныя валасы, лёгкая, доўгая, з фальбонамі сукенка... У руках — невялікі бубен з бляшкамі. Соф'я пачынае біць у бубен, азіраючы плошчу. Звон бубна прываблівае яшчэ некалькі гледачоў. Плошча ажывае. Соф'я прытанцоўвае ў такт музыцы і, выращыўшы, што гледачоў даволі, працягвае да іх рукі.

С о ф ' я *(дэкламуе ўзнёсла, вельмі тэатральна)*
Ледзь толькі ножкаю ступіла на зямлю,
пачула, як на ёй датла згараю...
І позіркам усім кажу: люблю!
І адказаць хутчэй вам тым жа раю!

Чуюцца адзінокія воплескі. Соф'я заўважае Радзівілаў. Позірк яе загараецца, твар успыхвае. Гучна стукнула ў бубен... Пачаўся танец. Адзін з камедыянтаў спрабуе падключыцца да яе, абдымае за стан. Соф'я адштурхоўвае яго. Танцуючы, спявае. Відно, што гэта імправізацыя.

Не хачу сягоння Яна,
бо чакаю кашталяна...
(Самазабыўна.)
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!
З роду княжага каханак
не ўзыходзіць на мой ганак!
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!

Ды аднойчы ў сенцах: бразь!
(Гучна б'е ў бубен.)
Да мяне нарэшце князь!
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!

Ён абняў мяне ўлюбёна
і... заблытаўся ў фальбонах!
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!
(З імпэтам трасе ножкай і фальбонамі.)
М а л а д ы   м е ш ч а н і н *(атарапела, гучна)*
Ажно ў руках пагасла самакрутка...
(Глядзіць на акурак.)
Як лётае, нібы ў паветры пёрка!
Была нядаўна — Соф'я-прастытутка,
а сёння, дайце веры мне, акцёрка!
С о ф ' я *(паўтарае)*
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!

Ды аднойчы ў сенцах: бразь!
Да мяне нарэшце князь!

О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!
Ён абняў мяне ўлюбёна
і... заблытаўся ў фальбонах!
О-йё-йё-й... О-йё-йё-й!
(З яшчэ большым імпэтам трасе ножкай і фальбонамі.)

Мікалай Чорны *(з захапленнем)*
Якія вочы, ножка... аж засоп я!
Якраз да часу сёння гэта Соф'я!

З фургона саскоквае падлетак у белым адзенні з крыламі анёла за спінаю. У руках трымае бліжчастую скрынку. Соф'я раскланьваецца... Падлетак пачынае абыходзіць усіх прысутных на плошчы. Збірае грошы.

Мікалай Руды
Усё! Няма чаго глядзець,
здаецца, далей!

Мікалай Чорны *(гучна да падлетка, вымаючы грошы)*
Сюды хадзі! Вазьмі! Тут цэлы талер!

Падлетак хутка падыходзіць. Падстаўляе скрынку... Мікалай Чорны кідае ў яе талер.

(Падкрэслена ласкава.)
Скажы, анёлак, добра знаеш Вільню?

Падлетак *(паспешліва)*
Так, як сябе...

Мікалай Чорны
Вазьмі яшчэ і грыўню!
(Кідае грошы ў скрынку.)

Падлетак міжволі радасна прыціскае скрынку да грудзей.

Мікалай Руды *(насмешліва)*
Глядзі, каб з радасці ды не адпалі
крылы!

Мікалай Чорны *(да падлетка)*
Павінен ведаць ты, мы — Радзівілы!
Ёй перадай...

(Паказвае позіркам на Соф'ю.)
Хай прыйдзе... Ёсць нагода!
Запомні добра, калі будзе згода,
увечары, а восьмае гадзіне...

П а д л е т а к *(няўпэўнена)*
Запозніцца...
Яна — ў другой карціне.

М і к а л а й Ч о р н ы *(не зважаючы на яго словы)*
Ёй, што пачуў, дакладна перакажаш
і дом патрэбны, калі што, пакажаш!

На плошчы з'яўляюцца ўсё новыя і новыя людзі. Зноў звініць бубен. Соф'я танцуе. Падлетак бяжыць праз плошчу да Соф'і. Мікалай Руды запытальна глядзіць на Мікалая Чорнага. Чорны разводзіць рукамі, маўляў, што зробіш...

Барбара — ўбок! Патрэбна ёй замена!
(З загадкавай усмешкай пазірае на Соф'ю.)
Камедыянтка... Прыйдзе несумненна!

Сцэна трэцяя

Замак вялікага князя ў Вільні. Адзін з пакояў замка. Адпаведная раскоша. Шмат прыгожых рэчаў. На сценах, абабітых парчою,— каштоўная зброя.

У крэсле ля століка сядзіць Ж ы г і м о н т II А ў г у с т. У руках трымае разгорнуты ліст з пячаткай — карэспандэнцыю ад маці: польскай каралевы Боны Сфорца.

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(глуха, з незадаволенасцю)*
Ліст за лістом...
То просьбы, то пагрозы!
Навошта, калі маю свой я розум?
(Прабягае вачамі по радках ліста.)
У маці, бачыш, прыкрыя навіны...
Я слухацца яе ва ўсім павінны!
Ах, Людвік Монці! Без яго напэўна
не абышлося...
Ён жа служыць верна!

Ва ўсім адну распусту бачыць Кракаў.
О як далася ім Барбара ў знакі!
*(Устае. Згортвае ліст. Шпурляе
яго на столік. Са злосцю.)*
Ну, хопіць!.. Начытаўся дастаткова.
(З іроніяй.)
Усцешыўся як след бацькоўскім словам.
*(Пачынае хадзіць па пакоі. Спыняецца
на паўкроку. Твар святлее.)*
Барбара...
Божа, адхілі замах
на ўсё, што ў сэрцы стала непарыўным.
Згубіць яе...
Цяпер падумаць страх!
Я ўвесь агнём захоплены прызыўным.
Мне да начы дажыць хапіла б сілы,
на ёй самкнуліся і зрок, і слых...

У пакой уваходзіць камердынер.
Паўза.
Жыгімонт Аўгуст спрабуе саўладаць з пачуццямі.

Камердынер
Мой светлы князь, у замку Радзівілы!
(Глядзіць запытальна.)
Жыгімонт Аўгуст *(саўладаўшы з сабой)*
Не стой!
Скажы, што я чакаю іх!

Камердынер выходзіць.

Дачуліся, напэўна, пра загад...
(З пачуццём самазадаволенасці.)
Мая Барбара – рымская князёўна.
Як будзе пасміхацца мне чароўна!
(Весела.)
І не шкада жыцця ўжо за пагляд.

Уваходзяць Радзівілы. Схіляюцца ў лёгкім паклоне.

М і к а л а й   Р у д ы *(падкрэслена суха)*
Вітаем князя! Вечная хвала
яму і Богу...
М і к а л а й   Ч о р н ы *(на адным дыханні, з запалам)*
Пільная патрэба
да князя нас сягоння прывяла!
Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(па-сяброўску, лагодна)*
Падумаць можна, выбухнула неба!
Як многа жару...
М і к а л а й   Р у д ы
Не дае маўчаць
нам болей крыўда за сястру Барбару!
М і к а л а й   Ч о р н ы
Мо не з таго патрэбна нам пачаць,
ды тут пячэ...
(Прыціскае руку да сэрца.)
Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(спрабуе жартаваць)*
Шукаць патрэбна лекаў!
М і к а л а й   Р у д ы
А я ў сваю чаргу дадам яшчэ —
не заслужылі мы падобных здзекаў!

Адварочваецца да акна.
Паўза.

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(з трывогай)*
Барбара... Крыўда...
І, нарэшце, здзекі!
Што за размова дзіўная здалёк?!
Спачатку думаў, у вас клопат нейкі,
і раптам чую, далібог, папрок?!
(З незадаволенасцю.)
У чым, скажыце? Не люблю загадак!
*(Гатовы ўсхадзіцца і, каб не
распаляцца, пачынае перабіраць паперы
на стале. Адсоўвае далей ліст Боны.)*
Як раздражняе гэты непарадак!

Мікалай Чорны

Здаецца,
ты ад праўды недалёка...

Паўза.

(Падбірае словы.)
Камусьці, бачыш, род наш вочы коле!
У справе гэткай змоўчаць мог бы лёкай,
а мы цярпець не хочам ганьбы болей.

Мікалай Руды

Ноч цёмная, ды некаму не спіцца.
Мы – тут, каб за Барбару заступіцца.
Ужо, лічы, ледзь не на кожнай плошчы
крычаць уголас пра яе любошчы!
І я нядобрым быў бы, пэўна ж, братам,
не ўзяўшы слова сёння з амарата...

Жыгімонт Аўгуст *(усхвалявана)*

О Божа, ваш прыход мне сном здаецца,
якое слова? Не магу даўмецца!

Мікалай Руды *(працягвае на ўзятай ноце)*

У спальню...
да Барбары, помніш дзверы?
Забудзь! Як і юрлівыя намеры.

Глядзіць запытальна на Жыгімонта Аўгуста. Мікалай Чорны стаў поруч з братам... Жыгімонт Аўгуст міжволі адступае да стала, на твары з'яўляецца незразумелая ўсмешка.

Жыгімонт Аўгуст

А тут павінна вырашыць яна...
Дый да размоў такіх я неахвочы!
(Адварочваецца.)

Мікалай Чорны

Ага... куды схаваць не знаеш вочы!
Як ноч, дык разам,
а як дзень, адна!
Барбара – ў брудзе... Сэрца точыць боль!

Сужыцелька — яна, а ты — анёл
бязгрэшны...
(З горыччу.)
А як верна мы служылі!

Мікалай Руды
Аддана як ахоўвалі твой трон!
Успомні, на Масковію хадзілі...
Мячы ў крыві і вояў енк і стогн.
І ўсё дзеля тваёй бліскучай славы,
ды як інакш? Сыны сваёй дзяржавы
ёй веліч здабывалі і... табе!

Мікалай Чорны
А вынік? Кіпцюрамі боль скрабе.
Барбара зганьбавана, небарака!
Ці ж гэткая
чакала нас падзяка?!

Жыгімонт Аўгуст *(рэзка)*
Ну хопіць вам! Не бачу ганьбавання.
Барбара пад крылом майго кахання.
Яе абераҗэ мая пяшчота...

Мікалай Чорны *(з'едліва)*
О-о, так... ды для чаго ж тады Лясота
з Літвы за межы тайна быў пасланы?!.

Жыгімонт Аўгуст *(здзіўлена)*
Вось як?
Папрок зусім неспадзяваны...
(Задумваецца.)

Мікалай Руды
Ты не адказвай, але дай нам слова,
каб не было гульні больш адмысловай.

Жыгімонт Аўгуст *(задумліва)*
Лясота пасылаўся... не таю.
Ды зараз не аб тым ужо гаворка.
Я слодыч піў, і раптам стала горка...
(Нечакана цвёрда.)
Вам слова трэба? Што ж, яго даю!

Паўза.

М і к а л а й   Р у д ы *(нібыта нават зніякавела)*
Мы змушаны былі, нас змусіў доўг
і перад родам, і перад Барбарай,
яна жыве ў сваіх салодкіх марах,
і акром нас хто б іх развеяць мог?
Ж ы г і м о н т   А ў г у с т
Я слова даў? Бог бачыць, не маню!
М і к а л а й   Ч о р н ы
О так...
Яно мілей нам ад брыльянтаў...
(Між іншым.)
А ў Вільні цесна ад камедыянтаў,
і сярод іх адна — уся з агню!
І думаеш, ці конны ты, ці пешы
ляціш на хараство...
М і к а л а й   Р у д ы *(ахвотна працягвае)*
Яно — палон...
А тая, што з агню, дальбог, пацешыць.
(Запытальна глядзіць на Жыгімонта Аўгуста.)
Мо й ты прыйсці не супраць на агонь?
М і к а л а й   Ч о р н ы
Увечары... а восьмае... як колісь,—
танюткі стан,
чароўны твар і голас.
(Загадкава пасміхаецца.)
М і к а л а й   Р у д ы *(з падкрэсленай пачцівасцю)*
Чакаем сёння ў бляску ды ў гуморы
і ўцехаў абяцаем табе мора.

Р а д з і в і л ы, не чакаючы адказу, раскланьваюцца і выходзяць. Жыгімонт Аўгуст кідаецца да стала, з ярасцю рве пісьмо, якое атрымаў ад маці.

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(на адным дыханні)*
Хай прахам пойдзе ўсё,
найперш турбота
бацькоўская... І трон мой, і Лясота!

Падумаць можна, наглытаўся ўгару,
о Божа, памажы забыць Барбару!
(З адчаем.)
Забыцца! Як? Упасці трэба ў шал,
з агню ў агонь,
вар'ятам у вар'яцтва,
каб раздзіраў душу нязнаны пал...
Каханне? Прэч! Лепш з д'яблам у сваяцтва
ўступіць...
(Спыняецца. Закрывае твар рукамі.)
Я слова даў... За што ж такая кара?!
Лясота!.. Пэўна ж ведае Барбара
ўсё пра яго...
Я — здраднік! Я — забойца
таго, што звязваць нас магло бясконца!
Якія ночы!.. Цела... вуснаў водар...

Паўза.

(Апускае рукі. І раптам страпянуўся.)
Ага-а... Успомніў! Сёння ёсць нагода.
Спакуса толькі б сэрца акрыліла!
(І ўжо зусім цвяроза.)
Вядома ж, буду сёння ў Радзівілаў!

Сцэна чацвёртая

Ружовы пакой у замку вялікага князя ў Вільні. Алькоў, зацягнуты карункавай фіранкай з кутасамі. На падлозе — ружовы пушысты дыван. На ім раскіданы жаночая сукенка з фальбонамі і іншыя больш інтымныя рэчы, без якіх не абысціся жанчыне.
Карункавая фіранка адсоўваецца. Паказваецца заспаны тварык камедыянткі Соф'і.

Соф'я *(пяшчотна)*
Ау-у, мой князь!.. О як салодка спіцца!

Адшморгвае фіранку. Саскоквае з ложка. Пацягваецца. Праз тонкую тканіну начнога ўбору прасвечваецца гнуткае цела.

Наяве ўсё, ці гэта толькі сніцца?
Які пакой, на мне якія ўборы!
(Цяжка ўздыхае.)
Вось толькі ў князя не салодкі нораў.
І баль мне абяцаў, і паляванне
і вось знікае ўжо другое ранне.
Стаў ноччу раўнадушным да пяшчоты,
яшчэ дзень, два...
                    І ссохну з адзіноты!
(Зноў пацягваецца. Падае на ложак.)
Ні князя, ні слугі...
                    І дзе сняданак?
Адно, салодка спіцца між фіранак.
Пасплю яшчэ. Патрэбна ўзбіць падушку
во так... во так,
                    каб мякка стала вушку.
*(Узбівае падушку і знаходзіць пад ёй
згорнуты аркуш паперы. Бярэ яго.
Здзіўлена.)*
Няйначай мне? Было як здагадацца,
што нехта гэтак стане заляцацца!
(Радасна.)
Напэўна, тоіць тайнае пасланне
нястрымнае гарачае прызнанне!
А што ж яшчэ?
(Разгортвае аркуш.)

У пакой уваходзіць Жыгімонт Аўгуст. Соф'я не заўважае яго. Прабягае вачамі па радках. Ускрыквае.

Ды тут перасцярога!
Мой князь наложніц меў занадта многа.
Мяне пакінуць можа ён брухатай,
як тую, што сядзіць на шыі брата!

Жыгімонт Аўгуст *(крычыць)*
Адкуль гэта ў цябе? Аддай сюды!
*(Падбягае да Соф'і, вырывае з яе рук
паперу, чытае і павольна камечыць аркуш.)*

Зноў пашквілюс! І гэтак два гады...
Цяпер я разумею Радзівілаў!
Сцярпець такое я і сам не ў сілах!
(Задумваецца.)

С о ф ' я *(нічога не разумеючы)*
А хто яна, што так цябе трывожыць?
(Чароўна пасміхаецца.)
Забудзь! Хадзі сюды хутчэй... на ложак!

Паўза.
Жыгімонт Аўгуст увесь у сваіх думках.

(Соф'я саскоквае з ложка. Хоча абняць яго.)
Мой слаўны князь, прыгожы мой, жаданы,
скажы, што мне ты ўсё яшчэ адданы?
(Лашчыцца да яго.)

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(груба адштурхоўвае Соф'ю)*
Ідзі адсюль... і як хутчэй!.. Даволі!
Вяртайся да ранейшай нейкай ролі.
Там твой фургон...

Соф'я пакрыўджана адварочваецца. Трошкі марудзіць... І пачынае апранацца, збіраючы з падлогі свае рэчы.

(Заціскае скамечаны аркуш у кулаку.
На Соф'ю не звяртае ніякай увагі.)
Ці праўда, ці абраза?
Брухатая?! Як многа злосці ў сказах!

Соф'я апранулася. Падышла да алькова. Уважліва разглядвае карункавую фіранку на ім, нібыта ўпершыню бачыць яе.

Соф'я *(ціха)*
Якія ўзоры?! Бы спляценне гронак...

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(крычыць)*
Сказаў я — прэч!

Соф'я нейкае імгненне глядзіць на Жыгімонта Аўгуста і павольна ідзе да дзвярэй. Жыгімонт Аўгуст паспешліва здымае пярсцёнак з пальца...

Чакай, вазьмі пярсцёнак!
(Ловіць руку Соф'і, хоча аддаць яго.)

Пярсцёнак падае на падлогу. Соф'я, не азірнуўшыся, выходзіць. Жыгімонт Аўгуст задумліва паўтарае, бы й не было Соф'і.

Брухатая?! Ці праўда, ці абраза?
(На твары адчай і разгубленасць.)
Звярнуцца да каго мне за адказам?!
О сэрца! Як суняць цяжкія ўдары!
Чаго ж я тут?
Мне трэба да Барбары!
(Імкліва выходзіць.)

Сцэна пятая

Спальня Барбары ў доме брата — Радзівіла Мікалая Рудога. Яна нечым нагадвае спальню Жыгімонта Аўгуста. Тыя ж ружовыя колеры, амаль той жа алькоў з карункавымі фіранкамі. Вечар. Багатае ўбранне спальні патанае ў паўзмроку.
Мікалай Руды запальвае свечкі ў цяжкіх падсвечніках.
Барбара з адсутным выглядам сядзіць у крэсле.
Мікалай Чорны праходжваецца з кутка ў куток...
У яго рухах адчуваецца нервовасць.

Мікалай Руды
З дзяцінства не люблю сядзець у змроку,
у сэрцы цені нараджалі страх...
То чуўся нейкі шэпт, то раптам крокі,
то шамаценне лёгкіх апранах!
Мікалай Чорны *(спыняецца)*
Не для таго прыйшоў я, каб пачуць,
што чулася калісь табе ў дзяцінстве...
Барбару словам нельга ўжо крануць,
дык як жа думкі будуць у адзінстве?!
Барбара
Ты, можа, хочаш, каб я разам з вамі
свой жар тушыла ўласнымі рукамі
пры дапамозе пашквілюсаў гнюсных?!

Цяпер маўчаць не будуць болей вусны!
Ты ўжо казаў, што я на шыі ў брата,
а зараз бачыш ты мяне брухатай?!
(Імкліва ўстае, вымае з невялікай
прыгожай скрыначкі, што стаіць на
століку, згорнуты аркуш паперы...)

Такі ж самы знайшла пад падушкай у спальні Жыгімонта Аўгуста камедыянтка Соф'я.

(Гнеўна.)
Вось пашквілюс! Упэўнена, што вы
абодва ў гэтым вінны нейкім чынам,
каб любы мне і ўжо не мой мужчына
згадаў, што мае на мяне правы.
Кахаў мяне, і вось ён... плод кахання!
(Нервова смяецца.)
А ў нас, дарэчы, не было расстання...

М і к а л а й Ч о р н ы *(выходзіць з сябе)*
Каханне ваша – цьфу!
Нам трэба ўлада!
І плод кахання – добрая прынада!

Б а р б а р а
Вар'яты!.. Божа! Праўда, вы –
вар'яты!
Якой інтрыгай дзікаю заняты!
Паддаўшыся, сама я ўсё руйную
і разам з тым гару ўся і раўную.
(Садзіцца ў крэсла.
Плечы ўздрыгваюць. Плача.)

М і к а л а й Р у д ы *(ніяк не можа запаліць апошнюю свечку)*
Тут зараз Мікалай сказаў пра ўладу...
Чакаем міласці з чужых уладных рук,
хоць не скажу...
Ёсць права ў нас на Раду[1],

[1] Вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў Вялікім княстве Літоўскім. У Раду ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы.

ды наша слова ў ёй староннi гук.
Мы на зямлі сваёй жывём сынамі,
і як сыны стаім мы за яе,
ды вершыць хтосьці зверху
суд над намі,
улада — ўсё!
Яе нам не стае.

Мікалай Чорны
Наўкола — зайздрасць!
А чаму зайздросціць?

Мікалай Руды
Заможнасць наша змучвае кагосьці.

Мікалай Чорны
Любыя скарбы без улады — тло!

Барбара *(усхліпвае)*
Так горка мне ніколі не было!

Мікалай Чорны
Мы пра Літву і пра сваю ў ёй пэўнасць,
яна ж — рыдае...
Душыць яе рэўнасць!

Барбара
Адзінае, што ў сэрцы горкім ёсць,—
мае пачуцці...
Можна насміхацца,
ды ўзяць сваё жадае маладосць,
і як, скажыце, ад сябе схавацца?

Мікалай Чорны *(зларадна)*
Ды нешта ж амарат твой не імчыць...
Акцёрка ў замку, чутка ёсць, начуе.
(Да Мікалая Рудога.)
Пайшлі адсюль!
Пра што з ёй гаварыць!
Яна даўно разумных слоў не чуе.

Радзівілы выходзяць.
Барбара ўстае з крэсла.

Барбара *(зніякавела, шэптам)*
Акцёрка?.. Скуль?..

Па Вільні ходзіць чутка?
Другі ўжо тыдзень, як яго не бачу.
Душа гарыць, і сэрца б'ецца пудка,
а радасць саступіла месца плачу.

Паўза.

Шлюб ладзіцца... Паверыла братам?
(Падыходзіць да акна.)

Паўза.

Як хутка ноч!
Міргае цьмяна зорка.
Сон – у мурах, і толькі недзе там,
у замку... цешыць шал яго акцёрка.

Чуецца асцярожны стук у акно. Яшчэ адзін і яшчэ...
Барбара ўздрыгвае.

Хто тут?
(Узіраецца ў цемру.)
Пачуе стражнік ля варот...
(І вельмі радасна, проста
захлынаючыся радасцю.)
Чакай... Адну хвіліну... Жыгімонт!
(Расчыняе акно.)

Жыгімонт Аўгуст ускоквае ў спальню. Прыпадае да рук Барбары... Палка цалуе іх.

Жыгімонт Аўгуст *(з жарам, словы блытаюцца)*
Ты!.. Ты!.. Мне даравала неба
яшчэ адно імгненне... Вось ён, міг!
А без цябе, як высахлая глеба,
я гіну... Ды нарэшце мы – ўдваіх!
Дай вусны мне...
(Цалуе Барбару, шэпча.)
Хай голас твой вясёлы
развее дзён нікчэмных каламуць

і ля ўзгалоўя нашага анёлы
на лютнях хай іграюць і пяюць.
Ты побач...
кожнай рыскаю і ўздыхам,
хутчэй мой жар сабою наталі...

Б а р б а р а *(трапятліва)*
Жаданы... я з табою...
(Прыслухоўваецца.)
Але ціха...
Хтось за дзвярыма... там...
(Глядзіць на дзверы, пасля на акно.)
Ці птушаня ў галлі?

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(не зважае на словы)*
Мая!.. Мая!..
(Абдымае Барбару, утрапёна цалуе твар, шыю.)
Ніхто адняць не зможа!

Дзверы з грукатам расчыняюцца. Імкліва ўваходзяць Р а д з і в і л ы. У руках — мячы. На тварах — тая няўтрымная рашучасць, калі чалавек здольны на ўсё. Барбара міжволі туліцца да Жыгімонта Аўгуста. Жыгімонт Аўгуст глядзіць з цікавасцю.

М і к а л а й Ч о р н ы *(у вялікім узрушэнні)*
Што бачу я?
(Да Мікалая Рудога.)
Ты, Мікалай, пазнаў
начнога госця?

Б а р б а р а *(шэпча)*
Робіцца што, Божа!

М і к а л а й Р у д ы *(да Барбары)*
Нядаўна Жыгімонт нам слова даў...

М і к а л а й Ч о р н ы *(паспешліва, таксама да Барбары)*
Што спыніць ён юрлівыя намеры
і ў спальню да цябе забудзе дзверы!
(Стукае мячом. Як непрытомны круціць галавою, маўляў, пераступіў парог, не стрымаў слова. Набліжаецца да Жыгімонта Аўгуста і Барбары. Спыняецца.)

Паўза.
Момант у нечым парадыйны.

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т

Вы ашалелі... Без яе мне цяжка.
(Прыціскае Барбару да сябе.)
Я для яе — не госць, а абарона...

М і к а л а й   Ч о р н ы *(гнеўна)*

Магчыма, ды з вялікаю нацяжкай!
Ты зноў прыйшоў,
каб наш запляміць гонар?

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т

Дарэмна гэтак... Хопіць вам шумець!
Вы будзеце, дальбог, нямала мець...

Мікалай Руды падыходзіць да брата. Абодва напружана слухаюць.

Уладу, славу...

М і к а л а й   Р у д ы *(змрочна)*

Гэта зноў падман!

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(не зважаючы на яго)*

Наўкола шляхта будзе віцца роем...

Мікалай Чорны адштурхоўвае брата. Выступае наперад.

М і к а л а й   Ч о р н ы

О Божа міласэрны, дай нам тое!
(Крычыць.)
Плябан!.. Хутчэй сюды, плябан!..

Усе глядзяць на дзверы. З’яўляецца п л я б а н. Ён нясе шлюбныя вянцы. Падаюць на падлогу мячы. Мікалай Чорны падбягае да плябана, забірае вянцы. Адзін аддае Мікалаю Рудому. Ідуць да Жыгімонта Аўгуста і Барбары. Плябан пачынае рыхтавацца да шлюбнага абраду. Мікалай Чорны ўзнімае вянец над галавою Жыгімонта Аўгуста. Над галавою Барбары вянец трымае Мікалай Руды.

М і к а л а й   Р у д ы *(да Жыгімонта Аўгуста)*

Калі сваёй Барбару лічыш любай,
дык любасць замацуй законным шлюбам!

Жыгімонт Аўгуст маўчыць.
Паўза.

М і к а л а й   Ч о р н ы *(усхвалявана, таксама да Жыгімонта Аўгуста)*
Скажы, як разумець тваё маўчанне?!

Жыгімонт Аўгуст маўчыць.
Паўза.

М і к а л а й   Р у д ы *(з радаснай упэўненасцю)*
Як згоду, несумненна, на вянчанне!

Жыгімонт Аўгуст моцна сціскае руку Барбары. Ён згодны.

Заслона

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

1548 год. Замак Радзівіла Мікалая Рудога ў Дубінках, недалёка ад Вільні. З восені 1547 года тут жыве Барбара. Так схацеў Жыгімонт II Аўгуст. Сам ён – то ў Кракаве, то ў Вільні... У Дубінкі ганцы прыносяць пісьмы, поўныя гарачай пяшчоты. Жыгімонт II Аўгуст спрабуе падрыхтаваць спрыяльную глебу, каб можна было афіцыйна аб'явіць, што ён узяў шлюб з Барбарай Радзівіл, але ўсе яго спробы натыкаюцца на нянавісць да Радзівілаў.

Сцэна шостая

Другі тыдзень красавіка. Аранжарэя. Праз шкляны дах льецца яркае красавіцкае сонца. Каб не гэты дах, можна было б падумаць, што позірк выхапіў куток райскага саду.
Лёгкае крэсла на адкрытай пляцоўцы. Ля яго – Б а р б а р а ў задуменнай позе. За некалькі крокаў ад яе – мастак Д а м і н і к. Ён піша партрэт Барбары.
З-за пышных гірляндаў дзівосных раслін выходзіць С т а н і с л а ў Д а в о й н а – давераная асоба Жыгімонта II Аўгуста, яго асабісты лекар. Ён апякуе Барбару.

Д а в о й н а *(да Дамініка)*

Не памылюся, пэўна, гэта пяты
партрэт Барбары?
Дзіўнае натхненне!
(У голасе чуецца непрыхаваная рэўнасць.)
Я думаў, ты маўчун дзівакаваты,
а тут такое раптам азарэнне!
Як твар змяніўся, рыхтык бы ў анёла!
(З усіх бакоў разглядвае партрэт.)
А вось Барбара тут глядзіцца кволай.

Д а м і н і к *(усмешліва)*

Вам не даруюць гэтых слоў нябёсы.
Зямля цяплом наўкола набрыняла.
Я ранкам слухаў, як смяюцца росы.
(Паварочваецца да Барбары. Вельмі лагодна.)
Барбара смех той у сябе ўвабрала.
Цяпер яна як сонца залатое...

Б а р б а р а *(смяецца)*

Вакол сябе раскідваю праменне!

Д а в о й н а *(глуха)*

Гляджу, вы тут здзяцінелі абое!

Д а м і н і к *(уздыхае)*

А вы дарэмна спудзілі натхненне.

Д а в о й н а *(раздражнёна)*

Як гаварыць мне з гэтым чалавекам?

Б а р б а р а *(паціскае плячамі. Насмешліва)*

Не ведаю...
Не я, а ты ў нас лекар!

Дамінік пачынае збіраць у скрынку фарбы. Зірнуў на партрэт, пасля на Барбару.

Д а м і н і к

Пісаў, як дазваляла мне майстэрства.

Д а в о й н а *(хоча, каб Дамінік хутчэй пайшоў)*

Ах, супакойся, ёсць жа падабенства!
Хоць радасці няма на гожым твары,
але відно, што гэта твар Барбары.

Б а р б а р а *(успыхвае)*
Скуль будзе радасць? Зноў ганца няма!
Мне з восені Дубінкі, што турма.
Д а в о й н а *(назірае за Дамінікам, калі ж той пойдзе)*

Дамінік марудзіць.

Цішэй, цішэй... вясна цвіце наўкола!
Сум быў, калі была прырода голай.
Б а р б а р а *(з горыччу)*
Няўдалы лёс!.. Блазнуе, што паяц...
У пострыг мо?
(Запытальна глядзіць на Давойну.)
Д а в о й н а *(ухіляецца ад адказу, бы й не чуе слоў Барбары. Паказвае на дах аранжарэі)*
Глядзі, як шкло іскрыцца!
Б а р б а р а *(з іроніяй)*
О так... Жыццё, бы казачны палац,
дзе здань на час прыкінулася прынцам.
Д а м і н і к *(гучна стукае вечкам скрынкі, у якую складваў фарбы)*
Ісці павінен я...
(Закахана глядзіць на Барбару. З сумам.)
Не прынц...
Не прынц, на жаль!
Б а р б а р а *(няўпэўнена)*
Пабудзь...
Трывожна стала сэрцу раптам.

Паўза.

(Да Давойны.)
А можа, нам наладзіць сёння баль?
Суседзі ёсць,
хоць дробная, ды шляхта!
Д а в о й н а
То баль, то ў пострыг...
Гэта несур'ёзна!

Суседзі ёсць, ды запрашаць іх позна!
Каб загадзя...

Д а м і н і к *(задумліва)*

Баль быць павінен пы-ышным!
Пайду...
Я тут ужо, напэўна, лішні.

Выходзіць.

Д а в о й н а *(з палёгкай)*

Нарэшце знік...
Бадзяецца без справы,
а колькі ганарлівасці на твары!
Ну яшчэ быў бы, скажам, багамаз!
Здаецца, з год ужо, як ён у вас?

Б а р б а р а *(з адчаем)*

Пра што пытанне?
Каб жа Дамінік
мяне на сёння мучыў і трывожыў!
Дзе Жыгімонт? За столькі дзён адвык,
мяне не ўспамінае нават, можа?
Начы адрозніць не магу ад ранку,
ёсць чуткі, што займеў сабе каханку.
Ад гэтых чутак пухне галава!

Д а в о й н а *(падыходзіць да Барбары, бярэ яе за локаць. Лёгенька штурхае)*

Глядзі, гатовы распусціцца ружы...

Б а р б а р а *(не звяртае ўвагі на яго словы, хоча выгаварыцца)*

Пляліся плёткі, дык была ўдава!
А зараз жонка? Пры адсутным мужы?
Хіба ж прызнае хто, што я за ім?!
Кароль Стары?
(Думае.)
Скажыце тое Боне!
Нявестка, хм-м-м? Што коле вочы ўсім!
І раптам поруч з сынам іх на троне.
Таго не будзе!..

Давойна лёгенька абдымае Барбару. Яна не адштурхоўвае яго. Павольна ідуць у глыб аранжарэі.

Стануць, як сцяна!
Маўляў, забудзь!.. Не вартая яна!..
Я ведаю, на ўсё,
што можна, пойдуць!
Скасуюць...
За мяжой нявестку знойдуць!

Хаваюцца за раслінамі. Гучаць толькі галасы.

Любому стануць кланяцца Двару...
Толькі б не я!

Д а в о й н а

Барбара, я — гару...
Згараю ўвесь!.. Спакою, сну няма!
Ёсць толькі ты!
Твой твар!
Тваё імя!

Паўза.

Не бачу свету... Колькі ж можна гэтак!
Пагасла сонца,
зніклі пахі кветак!
Калі не сёння... зараз... дык ніколі!
Хутчэй вярні душу маю з няволі.

Б а р б а р а

Не здзекуйся!

Д а в о й н а *(усхвалявана)*

З каго? Наадварот!

Паўза.

(Адрывістым шэптам.)
Я змучыўся... І ты... Таксама... Ты...
Усё зацьміла бляскам пекнаты...

Паўза.

Б а р б а р а

А мы адны?

Д а в о й н а

Адны!

Б а р б а р а *(вельмі ціха, без усялякай інтанацыі)*

А Жыгімонт...

Доўгая паўза.
У другім баку аранжарэі чуецца гучны ўсхваляваны голас Р а д з і в і- л а М і к а л а я Р у д о г а.

М і к а л а й Р у д ы

Ба-арба-ара! Божа!
Дзе яны? Дзе ўсе?!
(Выбягае на адкрытую пляцоўку.)
Бы ў ліхаманцы ўсё нутро трасе!
(Азіраецца наўкола. Спыняецца, глядзіць на незавершаны партрэт.)
Дзе Дамінік?!
Не бачу Станіслава...
Усё ў адно — і радасць, і навала!

З'яўляецца Барбара.

Б а р б а р а *(стрымана)*

Шукаў мяне?
(Збірае ў пучок раскіданыя па плячах валасы.)

М і к а л а й Р у д ы *(на адным дыханні)*

Тваёй турме канец!
Ад Жыгімонта...
З Вільні быў ганец!

З-за раслін выходзіць Давойна.

Не можам мы аслухацца загаду,
у Вільні трэба быць нам без адкладу!
(Глядзіць на Давойну.)
Астатняе дадумаеш сама...
(Хутка, адрывіста.)

Стары кароль памёр... Няма яго!.. Няма!
Збірайся... Заўтра...

Д а в о й н а *(вельмі ўражаны)*

Хто б падумаць мог?

Б а р б а р а *(думае аб нечым сваім, удакладняе)*

Усе?

М і к а л а й Р у д ы

Усе! І... памагай нам Бог!
(Пакідае аранжарэю.)

Б а р б а р а горда ўзняла галаву, ідзе следам за ім. Давойна застаецца адзін.

Сцэна сёмая

Чуецца жалобны звон званоў на званіцах цэркваў і касцёлаў. 17 красавіка 1548 года. Вільня. Тронная зала ў замку вялікага князя Вялікага княства Літоўскага. Тут усё гаворыць аб жалобе, якую перажывае княства. 1 красавіка 1548 года памёр Жыгімонт І Стары, вялікі князь Вялікага княства Літоўскага і кароль Польшчы.
Сцены залы абцягнуты чорным крэпам. Цьмяна гараць свечкі. Князі, шматлікія саноўнікі тоўпяцца ля трона. Адасоблена ад усіх стаяць Р а д з і в і л ы: М і к а л а й Р у д ы і М і к а л а й Ч о р н ы.

М і к а л а й Р у д ы *(не без пагарды)*

Сабраліся!.. Набеглі, што гайня.

М і к а л а й Ч о р н ы

Ды тут усе яны, лічы, штодня!
Калі не прыйдзеш, круцяцца вужамі!

М і к а л а й Р у д ы

І нешта ж асцярожна надта з намі
вядуць размовы сёння пра прастол...

М і к а л а й Ч о р н ы

Яшчэ б...
Цяпер адзін у нас кароль!
Няміласці для нас з іх кожны хоча,
ды не!..
(Смяецца.)

П е р ш ы   г о л а с *(гучна)*

Каму казыча д’ябал там вантробы?

Д р у г і   г о л а с *(з выклікам)*

Ім можна ўсё!

Т р э ц і   г о л а с *(з непаразуменнем)*

Смяюцца ў дзень жалобы!

М і к а л а й   Р у д ы

Пачулі... І адразу ж лямантуюць!

М і к а л а й   Ч о р н ы

Цішэй...

Маўчы.

З усіх бакоў цікуюць.

Звоняць званы на гарадскіх званіцах. Дзверы насупраць трона расчыняюцца. З’яўляецца к а м е р д ы н е р.

К а м е р д ы н е р *(гучна і ўрачыста)*

Яго вялікасць каралевіч, вялікі князь
Вялікага княства Літоўскага
Жыгімонт II Аўгуст!

У залу ўваходзіць Ж ы г і м о н т   А ў г у с т.
К а м е р д ы н е р выходзіць.

М і к а л а й   Р у д ы *(з хваляваннем)*

Усё... Нарэшце праясніцца... Зараз!

Г о л а с *(гучны шэпт)*

У Вільні?! Хто?

Хутчэй кажы... Барба-ара?!

Жыгімонт Аўгуст падыходзіць да трона. Садзіцца. Абводзіць позіркам усіх прысутных. Спыняе яго на Радзівілах.

Ж ы г і м о н т   А ў г у с т *(суха, адрывіста)*

Душа баліць...

Ва ўсім — няўцешны боль.

Мяне пакінуў бацька,

вас — кароль!

(Пераводзіць позірк на залу.)

Вядома вам, што ў Кракаве знянацку
прастол асірацеў...

Г о л а с *(ціхі шэпт)*

Як суха ён пра бацьку!

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(хутка паварочваецца на голас)*

Магчыма,
ды без слоўнае аздобы
даводжу вам у дзень сваёй жалобы,
што заўтра, патрабуюць надта справы,
у Кракаў еду... Зачакаўся Вавель!

Усе ўважліва слухаюць. Чуецца, як зноў звоняць званы на званіцах. Дзверы насупраць трона расчыняюцца. Уваходзіць к а м е р д ы н е р. Хутка ідзе да трона, штосьці шэпча Жыгімонту Аўгусту...

М і к а л а й Ч о р н ы *(да Рудога)*

Ты застаешся ў Вільні?

М і к а л а й Р у д ы

Несумненна!
(Паказвае на князёў і саноўнікаў,
што стаяць ля трона.)
Глядзі... камусьці стане зараз дрэнна!

К а м е р д ы н е р выходзіць.
Паўза.

Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(мякка, запаволена)*

Хай застаецца ўсё тут, як пры мне!
Нікога мая ласка не міне.
Ніколі не скупіўся на шчадроты,
цяпер уважце вы мае турботы...

Устае з трона, ідзе да дзвярэй, у якіх толькі што схаваўся камердынер. З шумам расчыняе іх... Усе глядзяць на дзверы. З’яўляецца Б а р б а р а. Уся ў чорным аксаміце, толькі ў вушах і на шыі праменяцца брыльянты. Па зале праходзіць лёгкі гул.

М і к а л а й Р у д ы *(да Чорнага)*

Што я казаў?! Зірні хутчэй на твары...
(Зноўківае ў бок саноўнікаў і князёў.)

М і к а л а й Ч о р н ы *(з захапленнем)*
Пагляду не адвесці ад Барбары.

Глядзіць толькі на Барбару і Жыгімонта Аўгуста. Жыгімонт Аўгуст вядзе Барбару да трона. Спыняюцца.

Г о л а с *(гучны шэпт)*
Як можна?!. На вачах ва ўсяго свету
абразіць так нябожчыцу Эльжбету!
Яе брыльянты!..
Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(заглушае гэты шэпт)*
Здарылася гэтак,
што я парушыць мусіў завядзёнку.
Не палічыўся з даўнім этыкетам
і... без каронпай Рады[1] выбраў жонку.
З ёй павянчаўся, кляўся перад Богам,
што будзе ў нас адна цяпер дарога!

Лёгкі гул праходзіць па зале.

Заняты быў апошнім часам крайне,
таму дасюль трымаў свой шлюб у тайне...

Зноў лёгкі гул галасоў.

І я шчаслівы вельмі тым, што ў пару
Бог даў, каго я сам хацеў,– Барбару!
Г о л а с *(гучны шэпт)*
Вось для чаго на гэтай мы нарадзе!
Д р у г і г о л а с *(прыглушаны)*
Чакай!..
Чакай, а хто ў каронпай Радзе?
Ж ы г і м о н т А ў г у с т *(рэзка)*
Я вынес клопат свой не на разгляд!
(Азірае ўсіх прысутных у зале.)
Наступнае прымайце, як загад!

[1] У Польшчы быў закон, які забараняў каралю браць шлюб без згоды на тое каронпай Рады. Жыгімонт Аўгуст у дадзеным выпадку парушыў гэты закон.

Вы ўсе павінны ў радасці ці ў гневе
ёй кланяцца заўжды як каралеве!

Прысутныя ў зале аслупянелі.
Барбара з захапленнем глядзіць на Жыгімонта Аўгуста. Радзівілы Мікалай Руды і Мікалай Чорны горда ўзнялі галовы. Звоняць званы на званіцах цэркваў і касцёлаў.

Сцэна восьмая

Лістапад 1550 года. Варшава. Багатая гасцёўня ў каралеўскім замку. Скрозь — бляск пазалоты. Шыкоўная мэбля таксама праменіцца бляскам. Ля каміна ляжыць палевы дог. Ярка палае агонь у каміне. Ля акна стаіць Бона Сфорца — каралева польская і вялікая княгіня літоўская. Узіраецца ў золь лістападаўскага дня.

Бона Сфорца *(глуха)*
То снег, то дождж...
Абклалі неба хмары.
Даўно няма ў прыродзе добрых знакаў.
Адна пахмурнасць...
Змрочны цень Барбары...
(Успыхвае, з гневам.)
Нягодніца! Прыбыць пасмела ў Кракаў!
На Вавель мой... І цешыць зараз рэчы
агідны зрок, каб мог хто асляпіць!

Паўза.

(З невыказным болем.)
О Жыгімонт... Як бацька твой пярэчыў,
а ты схацеў па-свойму ўсё зрабіць!
(Адварочваецца ад акна, ідзе да каміна, спыняецца. Глядзіць на агонь.)
І я ў Варшаве...
тут... нібы ў выгнанні,
што ні казала,— словы не дайшлі!
Дарэмнымі былі ўсе намаганні...

(Садзіцца ў крэсла. З нянавісцю.)
Правоў ім мала,
золата,
зямлі...
Паквапіліся! Лёгка акруцілі.
Змяя схавала джала ў нейкі міг.
(З адчаем.)
На троне з сынам... поруч Радзівілы!
І як мне саўладаць з нахабствам іх?!

Дог устае, ідзе да дзвярэй.

З іх хітрасцю?! Яна была яскравай.
Барбара – толькі лялька ў іх гульні...

Уваходзіць п а к а ё ў к а. Бона ўскідвае на яе запытальны позірк.

П а к а ё ў к а *(ціха)*
Танчынскі Ян...
Гаворыць, з важнай справай!

Паўза.

Б о н а С ф о р ц а
Пакліч...
Хай пагамоніць пры агні!

П а к а ё ў к а выходзіць.

Змяніць штось хоча, але толку мала.
(Цяжка ўздыхае.)
Што зробіш тут? Навала ёсць навала!

З'яўляецца Т а н ч ы н с к і. Схіляецца ў глыбокім паклоне.

Т а н ч ы н с к і
Не маю слоў, каб выказаць пашану,
любоў сваю...
Б о н а С ф о р ц а
Не трэба гэтых слоў!
Прысядзь...
(Паказвае на крэсла па другі бок каміна.)

Ты быў заўсёды мне адданы.

Паўза.
Танчынскі з шумам садзіцца. Бона задуменна глядзіць на агонь.

Агонь ратуе... стыне ў жылах кроў,
не ўкладваецца, як ён мог паддацца!
Спачатку думалася —
маладосці грэх...

Танчынскі *(з'едліва)*
Яна паспела добра ўладкавацца!
Аж стогне Кракаў, кажуць, ад уцех.
А ён што блазен...

Паўза.

(Са злосцю.)
Знойдзецца дзівак!
Сарве карону і... падасць каўпак.

Бона Сфорца *(уважліва глядзіць на Танчынскага. Строга)*
Таму я тут, што ў Кракаве Барбара.

Танчынскі *(угодліва)*
І Чорны там... Мярзотная пачвара!
Гавораць, ён яе каханкам быў.
Нацешыўся! І Жыгімонту збыў!

Твар Боны перасмыкнуўся.

На дыбу іх, караць трэба агнём,
бо Кракаў ператвораць у Садом!
Штодня — музыкі,
баль за балем,
спевы...

Бона Сфорца *(сціскае скроні)*
Бы ў абцугах гарачых галава.

Танчынскі
Цяпер любая на Літве ўдава
з пярыны жаркай схоча ў каралевы!

Падумаць!

Перад ім укленчыў Сейм[1]!

Бона Сфорца

Няўжо сцярпець такое я павінна?
Упэўнена, без выключэння ўсе
на Захадзе адвернуцца ад сына.

Танчынскі

Вядома, хто ж лічыцца зараз будзе
з дзяржавай,
дзе кароль сядзіць у блудзе!
(Прыцішаным голасам.)
Нам трэба ратаваць хутчэй прастол.

Бона Сфорца *(міжволі ўздрыгвае)*

Прастол?
(Зноў сціскае скроні.)
Ніяк не пройдзе гэты боль,
не ведаю, за што такая кара!

Танчынскі

А хутка карануецца Барбара!

Бона Сфорца *(імкліва ўстае з крэсла)*

Не дапушчу!

Танчынскі *(з нейкай патаемнай думкай)*

Каб ведаць жа тут як?
(Таксама ўстае з крэсла.)
Баюся, позна!

Бона Сфорца *(з адчаем)*

Лёсу чорны знак?!
(Нервова.)
О не!.. О не!.. Скасую ўсё... Парушу!
(Пачынае хадзіць па гасцёўні.)

---

[1] У канцы 1548 года праходзіў Сейм у Петрыкаве, на якім абмяркоўвалася справа каралеўскага шлюбу з Барбарай Радзівіл. Удзельнікі Сейма патрабавалі, каб шлюб быў скасаваны, але Жыгімонт Аўгуст адмовіўся. Тады ўвесь Сейм укленчыў перад ім, толькі ж і гэта не падзейнічала. Жыгімонт Аўгуст стаяў на сваім, у выніку чаго, нягледзячы на моцную апазіцыю, шлюб быў прызнаны законным.

Танчынскі

А я пакінуць каралеву мушу.
(Ідзе да яе. На момант прыпыняецца.)
Народ бурліць... І, Божа, барані
наш край ад непатрэбнае вайны.
(Падыходзіць да Боны. Цалуе руку.
Цяжка ўздыхае. Пяшчотна.)
Хацеў бы бачыць каралеву ў шчасці...

Бона Сфорца

Не ўратавацца мне ўжо ад напасці!
Ідзі...
Улады болей тут не маю.
(Задумалася.)
Чужы мне край...
І я чужая краю.

Танчынскі схіляецца ў глыбокім паклоне. Выходзіць.
Паўза.

(Падыходзіць да дога, які разлёгся ў парозе.
Лашчыць яго.)
Сумуеш?.. Да цябе няўважнай стала?
Каб ведаў ты, як зараз горка мне!
Танчынскі... Ці ж не праўду я сказала —
чужая гэтай змрочнай старане.
І сын — чужы...
Ён выбраў Радзівілаў...
(Вяртаецца да каміна. Глядзіць на агонь.)
Ну хоць бы колькі напісаў радкоў!
Яго, здаецца, нават не здзівіла,
што я ў Варшаву з’ехала цішком.
Навошта я?
Там без мяне ўсё — проста...
За балем — баль!
Ёй хоча дагадзіць...
Барбара!

Паўза.

(З гневам.)

Будзе вельмі страшнай помста...
Я ведаю, што трэба мне рабіць!
Мой сын, яна і я...
Які трохкутнік!
Ды відавочна — лішні нейкі кут!
(Імкліва ідзе да дзвярэй. Расчыняе іх. Крычыць.)
Сюды!.. Хутчэй!.. Дзе Монці?
Дзе мой Людвік?!
(Прычыняе дзверы. Ціха.)
Ён... Толькі ён... патрэбен зараз тут!
(Ідзе да акна.)

Уваходзіць Л ю д в і к М о н ц і. Бона не азіраецца. Глядзіць у акно.

Па кроках чую — ты... І не тлумачу,
што да чаго! Ты бачыш гэта сам,
як я гарую, курчуся ад плачу,
збірайся ў Кракаў!

Паўза.

Справа будзе там!

Монці стаіць ля дзвярэй. Уважліва слухае. Моўчкі ківае галавой.

Мой сын адзіны...
Боль мой і пакута...
Ты ведаеш, чый цень між намі лёг!

Монці моўчкі ківае.

Дзе словы не даходзяць, там атрута
ўсё вырашае! Хай даруе Бог
і дапаможа... Хай нашле ён кару
з тваёю дапамогай на Барбару!
Абедзвюм на зямлі нам нельга жыць.

Паўза.

Ты зразумеў? Не мне цябе вучыць!

Монці моўчкі ківае. Ён зразумеў.

Сцэна дзевятая

Канец снежня 1550 года. Кракаў. Некалькі тыдняў таму назад адбылося каранаванне Барбары.

Невялікая гасцёўня ў каралеўскім палацы. Час абеду. Пышна накрыты стол. За сталом сядзяць Жыгімонт II Аўгуст, Барбара і Людвік Монці – сакратар каралевы Боны. Гавораць ажыўлена, у прыўзнятым настроі.

Монці

Хацеў паспець я на каранаванне,
ды затрымалі клопаты ў Варшаве.

Жыгімонт Аўгуст

Што ж, сакратар павінен быць пры справе...
(Глядзіць на Барбару.)
Нас матчына сагрэла віншаванне.
Ёй на карысць, гляджу, жыццё ў Варшаве,
брыльянты праслала... Тры ў аправе!

Барбара *(з годнасцю, уласцівай каралеве)*

Не трэба ні брыльянтаў, ні сапфіраў,
адно, каб з ёю мы жылі суладна.

Монці *(угодліва)*

З тым і прыехаў... Хоча з сынам міру.
Так і сказала: перадай дакладна.

Барбара

Віна мая тут, ды хіба ж хацела?

Жыгімонт Аўгуст

Ах, Божа, ты галубкаю ўляцела
ў мой лёс і ўсё навокал асвяціла,
напоўніла мяне дзівоснай сілай,
а тут... сцяна!
(Моршчыцца.)
І слёзы маці... Сваркі...
З усіх бакоў – пагрозы, забарона...

Монці

За іншае паднімем зараз чаркі,
за шчасце ваша!
За магутнасць трона!
(Паднімае чарку. П'е.)

Барбара і Жыгімонт Аўгуст толькі прыгубліваюць.

Жыгімонт Аўгуст *(ставіць чарку на стол)*
Ад Габсбурга[1] пасол у троннай зале
павінен быць. Пакіну вас адных.
(Да Монці.)
Шкадую, што пабыў з табою мала...
Ты маці перадай — не помню злых
яе намераў. Тое ўсё забыта.
(Устае з-за стала.)
Мая душа насустрач ёй адкрыта,
ёй не чужы, як і калісьці, Вавель.
(Глядзіць на Барбару.)
Скажы, што хочам бачыць неўзабаве!

Барбара
Я ўкленчыць перад ёй заўжды гатова.

Монці
Яна ўжо благаславіла вас на словах,
і думаю, што неўзабаве схоча
вас благаславіць, як кажуць, вочы ў вочы.

Жыгімонт Аўгуст
Хай Бог дае...
(Цалуе руку Барбары. З лёгкай усмешкай.)
Тут, пад тваім наглядам,
пабыць, напэўна, Людвік будзе рады!
*(Ківае Людвіку, маўляў, развітваюся...
Выходзіць.)*

Паўза.

Монці
Змяніўся Аўгуст...
Знікнуў недавер,
зусім вярнуўся іншым ён з Літвы.

Барбара
Не ведалі яго, магчыма, вы!
Ён быў заўжды такім, як і цяпер.

---
[1] Фердынанд Габсбург, імператар рымска-нямецкі, бацька Эльжбеты Аўстрыйскай.

М о н ц і

О не скажыце, часта быў круты,
ды пад уплывам вашай пекнаты
куды і знікла колішняя ўпартасць?!

Б а р б а р а

Пра колішняе ўспамінаць не варта!

М о н ц і

Напэўна...
(Задумліва.)
Не ўсялякая зямля
тым сокам, што патрэбен, жывіць дрэва.
Пра што ж я?
(Смяецца.)
А-а! Свет бачыць караля,
якім яго ўспрымае каралева!
Любыя Аўгуст зможа зрушыць горы...
(Не дагаворвае.)

Дзверы ў гасцёўню расчыняюцца. Уваходзіць п а к а ё ў к а.

П а к а ё ў к а *(схіляецца ў паклоне. Да Барбары)*

Не ведаю, як быць? Прынеслі вам уборы.

Паўза.

Магчыма, будзе нешта ў іх не так,
сказаць, каб пачакалі вас, ці як?!

М о н ц і *(паспешліва да Барбары)*

Уборы?!
(Смяецца.)
Для жанчыны гэта важна.
Адкладваць нельга, мілая Барбара!

Паўза.

Уборы... Хм-м? Як позіркі раздражняць!
Пачуцці ўскалыхнуць, навеюць мараў!
Ісці патрэбна... У мяне ёсць час,
магу чакаць...
слугою верным вас!

Б а р б а р а *(устае з-за стала)*
Тады я на хвілінку... Толькі гляну!

Б а р б а р а і п а к а ё ў к а выходзяць.

М о н ц і *(не можа схаваць радасці)*
Усё ідзе, дальбог жа, як па плану!

Паўза.

(Нейкае імгненне сядзіць нерухома.
Вочы загараюцца нядобрым бляскам.
Адкідваецца назад, на спінку крэсла.)
Ну вось і момант! Што ж маруджу я?
(Нервова смяецца.)
Ха-ха... Уборы! Выйшла ўсё так складна!
О як сябе тут пачувае ўладна
нягодніца!
Распусніца!
Змяя!
(Рэзка ўстае. Ідзе да акна. Спрабуе
расчыніць створкі.)
Хоць бы паветра свежага глыток,
не задыхнуцца б!
Што ж цягну з атрутай?
Адзіны крок...
(Глядзіць на чарку, з якой прыгублівала
Барбара.)
Да чаркі толькі крок...
(Робіць гэты крок. Спыняецца ля крэсла,
на якім толькі што сядзела Барбара.)
І ўсё... Сцяжына лёсу разамкнута!
Жыцця няма... Што Вавель? Што карона?
(Хуткімі рухамі вымае з кішэні скураны
вузельчык. Рукі трасуцца. Азіраецца
на дзверы. Імкліва развязвае...)
Хай будзе так, як пажадала Бона!
(Высыпае ў чарку атруту. Вузельчык
хавае ў кішэні.)

І калі можаш, дык даруй мне, Божа,
Барбары ўжо нішто не дапаможа!

Дзверы расчыняюцца. Уваходзіць Б а р б а р а.

Б а р б а р а
Прымусіла чакаць?

М о н ц і *(спрабуе быць вельмі лагодным)*
Ды не!..
(Адварочваецца да акна.)
У хмарах неба...
(Цяжка ўздыхае.)
Што зробіш, не чакаюць доўга справы!
Два тыдні ўжо, як з’ехаў я з Варшавы,
засумаваў...
Назад збірацца трэба!

Б а р б а р а
Ад нас адразу?

М о н ц і
Думаю, што так!
Прысесці толькі трэба на дарогу...
(Садзіцца. Лёгкім рухам рукі запрашае сесці і Барбару.)
Штодня за вас маліцца буду Богу,
каб беды ўсе былі для вас няўзнак!

Б а р б а р а *(устрывожана)*
Якія беды?
(Садзіцца на ранейшае месца.)

М о н ц і
Гэта я да слова!
А зараз у мяне ёсць прапанова!
(Бярэ чарку. Паднімае яе.)
За маці!

Паўза.

Шчасця зычыць вам яна!
За каралеву Бону і... да дна!
(Выпівае.)

Б а р б а р а бярэ сваю чарку. Марудзіць... і таксама п’е.

Хай чарка пойдзе на карысць здароўю,
каб жыць сто год у згодзе са свякроўю!

Сцэна дзесятая

8 мая 1551 года. Кракаў. Спальня Барбары ў каралеўскім замку. Шырокі ложак падцягнуты да расчыненага акна. Ледзь не над самым падваконнем звісаюць пышныя гронкі бэзу.

На ложку ляжыць Б а р б а р а. Уваходзіць М і к а л а й Р у д ы. Спыняецца ў дзвярах.

Б а р б а р а *(ціха)*

Хадзі сюды... Да ложка падыдзі...
Мой мілы брат, шкада, што я не дома!

Мікалай Руды хутка падыходзіць да ложка. Барбара спрабуе пасміхнуцца.

Не на мяне... На гэты бэз глядзі,
я надта ж змучана хваробай невядомай.

Недзе ў далёкіх пакоях замка б’е гадзіннік.

(Барбара лічыць.)
Адзін... другі... яшчэ адзін удар...
Адпушчана гадзін мне, чую, мала!

Мікалай Руды садзіцца на ложак. Бярэ руку Барбары ў сваю. Гладзіць яе шчаку.

М і к а л а й Р у д ы

Схуднеў,
але ўсё роўна гожы твар...
Хоць і пакут даволі ты зазнала.

Б а р б а р а *(пагаджаецца)*

Цяпер — хвароба,
а раней — няслава,
Які сягоння дзень?

М і к а л а й   Р у д ы

Святога Станіслава!
Чацвер... Ты не трывожся...
Гэта шкодна.

Б а р б а р а

Мне цяжка...
На зямлі памру нянароднай.
Чужыя сцены, галасы, імёны...
У Вільню б хоць на міг, у Геранёны.

М і к а л а й   Р у д ы

Пра смерць не думай,
гэтага не будзе...

Б а р б а р а *(глыбока ўздыхае)*

Не прадыхнуць,
бы камень лёг на грудзі.
(Зусім ціха.)
Уся гару, нібы абліта варам.
(Пачынае кідацца.)

М і к а л а й   Р у д ы *(усхапіўся з ложка)*

Пагоршала?..
Мо доктара, Барбара?!
(І ўбок, ціха.)
Але ж пазнала...
Чуў, назвала братам.
Якой жа непамернай будзе страта!
Была ў сабе і доўга...
(Схіляецца над Барбарай.)

Барбара кідаецца ў гарачцы.

Б а р б а р а

Дзе я?.. Дзе я?..
(І суцішваецца.)

М і к а л а й   Р у д ы

Маленечкая, але ёсць надзея!
Суцішылася... Пасвятлелі вочы...
Няма сумнення:
хтось яе сурочыў!

Паўза.
За дзвярыма чуюцца гучныя хуткія крокі.

Нехта ідзе!..
Мо Жыгімонт так шпарка?

Дзверы расчыняюцца. Імкліва ўваходзіць Жыгімонт Аўгуст.

Жыгімонт Аўгуст
З Літвы вярнуўся Чорны!..
З ім — вядзьмарка.
Барбара як?
(Ідзе да ложка. Схіляецца над Барбарай.)

Мікалай Руды
Гарачка доўга біла.
Цяпер, здаецца, трошкі адпусціла.

У спальню ўваходзіць Мікалай Чорны.

Мікалай Чорны
Вядзьмарка хоча як хутчэй да хворай!

Жыгімонт Аўгуст цалуе рукі Барбары. Мікалай Руды адмахваецца ад Чорнага, маўляў, маўчы! Чорны паказвае позіркам на Барбару.

(Прыцішана.)
А як яна?..

Жыгімонт Аўгуст паварочваецца да Радзівілаў.

Жыгімонт Аўгуст *(з горыччу)*
Дасюль не меў я гора
сапраўднага...

Мікалай Руды
Яно заўжды не ў час!

Барбара прыўзнімае галаву. Яна вельмі змарнела. Твар непазнавальна асунуўся. Усе напружана сочаць за яе рухамі. Барбара цягне руку да Жыгімонта Аўгуста...

Барбара
Скажы, няхай браты пакінуць нас.

Мікалай Руды

Мы чуем, чуем...

Пойдзем у гасцёўню!

(Ідзе да дзвярэй. Ціха да Чорнага.)

Ты бачыш?

Як жа можна тут без слёз!

Мікалай Чорны *(вельмі ўражана)*

Такой Барбару, далібог, не помню...
Відно, дарма з Літвы вядзьмарку вёз.

Радзівілы выходзяць.
Паўза.

Барбара

Пайшлі...

Ты помні, мне яны — браты.

Жыгімонт Аўгуст

Пра гэта зараз не турбуйся ты.
(Бярэ яе рукі ў свае.)

Паўза.

Барбара

Не ведаю, што там...
(Глядзіць уверх. Са шкадаваннем.)
Можа, нічога?

Жыгімонт Аўгуст

Там Бог!

Я за цябе Яго прашу.

Барбара

Тады я там пачну прасіць у Бога,
каб адпускаў сюды маю душу[1]...
Мой лёс зямны пакутаю кляймёны,
такія мукі зараз я цярплю!

[1] Сярод паданняў Нясвіжа ёсць адно, у якім расказваецца пра Чорную даму. У XVI стагоддзі Нясвіж належаў Радзівілу Мікалаю Чорнаму. Пасля смерці Барбары там і пачала зрэдку з'яўляцца Чорная дама — душа Барбары, апранутая ў чорнае адзенне ў знак жалобы па сваім каханні. А калі памёр і Жыгімонт II Аўгуст, Чорная дама пасялілася ў Нясвіжскім замку назаўсёды.

О Жыгімонт...
Ты помніш Геранёны
і да цябе найпершае «люблю»?!
Кахаю, веру... Гэта ўсё са мною,
яно ўва мне... У сэрцы толькі ты!
Цяпер і потым, калі ўжо сцяною
між намі ляжа вечнасць нематы.

Паўза.

*(Захвалявалася. У вачах з'явілася
няясная трывога.)*
Цалуй мяне ў апошнюю хвіліну!
Ірвецца дух... Навошта так імкне?
Я выпаду аднойчы са ўспаміну,
а губы будуць сумаваць па мне...

Жыгімонт Аўгуст прыпадае да губ Барбары.
Паўза.

Жыгімонт Аўгуст
Не пакідай... З табою быў шчаслівы!
Жыццё маё дзеля цябе было...

Барбара прыўзнімаецца.

Барбара
Я ведаю...
(Глыбока ўздыхае.)
Куды ж ён, дух імклівы?
(Ледзь чутна.)
Твой твар плыве... У вочы б'е святло...
(І заціхае, адкідваецца на падушку.)
Жыгімонт Аўгуст *(схіляецца над нерухомым
целам Барбары. Бы не ў сабе)*
Няма!..
Як хутка?!
Божа літасцівы!
Аддай!..

Ты чуў, я з ёю быў шчаслівы!
(Укленчвае перад ложкам. Працягвае рукі ўверх... да Бога.)

Адтуль наплывае жаласлівы спеў, а можа, гэта толькі так здаецца Жыгімонту Аўгусту.

Хор анёлаў

Імкне душа ў апошнюю дарогу,
зямны прытулак зведаўшы спаўна,
у тыя высі, дзе раскажа Богу
пра ўсё, з чым развіталася яна.
(І на больш высокай ноце.)
Ляціць душа ў апошні свой прыстанак,
свой пэўны час адбыўшы на зямлі...
З начы глухой у вечны свой світанак,
у пекныя нябесныя палі...

Паўза.
Жыгімонт Аўгуст паднімаецца... Нейкае імгненне глядзіць у нерухомы твар Барбары.

Жыгімонт Аўгуст *(з болем, з жалем, з тугою)*

Хто зараз чуе голас твой прызыўны?
Хілю ў жалобе чорнай галаву...
Даруй, калі я ў нечым, можа, вінны,
з Літвы прывёз і павязу ў Літву.

Заслона

1992